## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ: САКРАТАРЫ ДЗЕЛЯЦЦА ВОПЫТАМ ● АДКАЗНАСЦЬ ВЫДАТНІКА ● САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА: ТРЫВАЛЫЯ СУВЯЗІ ● У ГАСЦЯХ У ГУРТКОЎЦАЎ ● ХТО ПАЕДЗЕ ЗА МЯЖУ ● ДА XI СУСВЕТНАГА ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ У ГАВАНЕ ● ГРУПА «ДОЎГ» ПРАЦЯГВАЕ ПОШУК ● ГЕОГРАФЫ ● ДЗЕЛАВАЯ РАЗМОВА ● СТУДЭНЦКІ НАРОДНЫ ● ...І БЫЎ МЕДЫУМ ● НОВЫЯ КНІГІ



ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (1197) ● 23 сакавіка 1978 г. Цана 2 кап.


Камсамольскае жыццё

## САКРАТАРЫ ДЗЕЛЯЦЦА ВОПЫТАМ

**На працягу некалькіх дзён у Мінску праходзіў занальны семінар сакратароў камітэтаў камсамола ВНУ Беларусі, рэспублік Прыбалтыкі і Малдавіі. Удзельнікі семінара абмеркавалі шэраг важных пытанняў, абмяняліся вопытам камсамольскай работы, наведалі некаторыя навучальныя ўстановы нашага горада, дзе пазнаёміліся з практычнай дзейнасцю камсамольскіх арганізацый.**

Двойчы ўдзельнікаў занальнага семінара прымаў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Першае знаёмства адбылося на радыёфізічным факультэце, дзе для гасцей быў арганізаван вечар адпачынку. Ва ўтульнай зале сабраліся прадстаўнікі камсамоліі пяці саюзных рэспублік. Рашыд Шамсутдзінаў — намеснік сакратара камсамольскай арганізацыі Эстонскага дзяржаўнага мастацкага інстытута — толькі некалькі дзён, як вярнуўся з паездкі ў саставе агітпоезда ЦК ВЛКСМ «Комсомольская правда» па заходняму ўчастку БАМа. Звыш шасцісот кіламетраў па існуючай і будучай трасе, дваццаць пяць шэфскіх канцэртаў, сустрэча з маладымі эстонскімі будаўнікамі ў пасёлку Уаян — такі вынік гэтай паездкі.

Уражанні, жарты, прывітанні... Хвалюючыя хвіліны падрыхтоўкі і чакання былі шчыра ўзнагароджаны добрым настроем гаспадароў і гасцей. Студэнты універсітэта падрыхтавалі невялікі, але цікавы канцэрт.

16 сакавіка ўдзельнікі занальнай нарады зноў сабраліся ў БДУ. Тут быў арганізаван рабочы семінар па абмену вопытам работы.

— Мы прыехалі абмеркаваць хвалюючыя нас праблемы па важнейшых напрамках работы камітэтаў камсамола ВНУ, — расказвае сакратар камітэта камсамола Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Анатоль Кашчук.

— У прыватнасці, я выступіў на семінары з дакладам аб арганізацыі работы камітэта камсамола нашага універсітэта з саветам выдатнікаў. Важнымі для мяне былі паведамленні маіх калег аб формах работы па інтэрнацыянальнаму і маральнаму выхаванню. У вашай камсамольскай арганізацыі, на мой погляд, заслугоўвае вялікай увагі работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню, арганізацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Удзельнікі нарады праслухалі шэраг лекцый, азнаёміліся з некаторымі новымі пастановамі і інструктыўнымі ўказаннямі цэнтральных органаў ВЛКСМ, паставілі некаторыя пытанні перад Цэнтральным Камітэтам камсамола.

Несумненна, гэты форум будзе мець вялікае практычнае значэнне для дзейнасці камсамольскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў.

**Т. НІЧЫПАРУК,**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

Слова савету выдатнікаў

## АДКАЗНАСЦЬ ВЫДАТНІКА

Удасканаленне форм і метадаў работы па падрыхтоўцы і выхаванню высокакваліфікаваных, ідэйна перакананых спецыялістаў, будучых арганізатараў і выхавацеляў— адзін з асноўных напрамкаў работы камсамольскай арганізацыі БДУ.

Адным са шляхоў рашэння гэтай комплекснай задачы з'яўляецца распаўсюджанне вопыту лепшых студэнтаў-выдатнікаў універсітэта, арганізацыя выдатнікамі дапамогі адстаючым студэнтам.

Быць студэнтам-выдатнікам — гэта значыць не толькі вучыцца выдатна самому, але і рабіць усё для таго, каб твой таварыш вучыўся лепш, каб перадаць яму частку сваіх ведаў. Лозунг сацыялістычнага спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач!» азначае маральную адказнасць кожнага выдатніка за паспяховасць свайго таварыша. Таму галоўны напрамак работы савета выдатнікаў пры камітэце камсамола БДУ—зрабіць так, каб кожны добра паспяваючы студэнт унёс пасільны ўклад у павышэнне паспяховасці ў сябе ў групе, на курсе, факультэце. З гэтай мэтай членамі савета выдатнікаў на факультэтах былі арганізаваны кансультацыйныя пункты, групы дапамогі адстаючым. Формы дапамогі самыя разнастайныя. Гэта арганізацыя выдатнікамі кансультацый у інтэрнаце і на факультэце; бягучыя кансультацыі і работа кансультацыйных пунктаў па цвёрдаму графіку; кансультацыі, якія праводзяцца выдатнікамі сумесна з выкладчыкамі.

**Кансультацыйныя пункты працуюць на геафаку, гістфаку, ФПМ, радыёфізічным, механіка-матэматычным факультэтах. Хочацца адзначыць высокі ўзровень і арганізаванасць правядзення кансультацый выдатнікамі механіка-матэматычнага факультэта (адказная за сектар па рабоце з выдатнікамі Т. Шумак). Гэтыя кансультацыі праводзяцца выдатнікамі ў сябе ў групах, і хаця наведванне іх неабавязковае, прысутнічаюць амаль усе, задаюць шмат пытанняў, і, калі паяўляюцца цяжкасці ў вырашэнні, звяртаюцца да выкладчыкаў. Разам з тым у гэтай рабоце на асобных факультэтах маюцца недахопы. Так, на фізфаку савет выдатнікаў і камітэт камсамола факультэта не ўдзяляюць патрэбнай увагі гэтай форме работы, хаця па выніках зімовай сесіі факультэт займае перадапошняе месца ва універсітэце. Нягледзячы на тое, што ў плане сектара па рабоце з выдатнікамі фізфака запісана аб неабходнасці арганізацыі кансультацый па найбольш цяжкіх прадметах, у І семестры 1977-78 навучальнага года кансультацыйныя пункты арганізаваны не былі. Хочацца адзначыць, што незаслужана забываецца амаль усімі факультэтамі такая форма работы з адстаючымі, як індывідуальнае шэфства. Як правіла, да такой формы работы звяртаюцца ў «аварыйнай» сітуацыі, калі студэнт, які не здаў экзамен, рыхтуецца да пераздачы. А двойкі можна было б не дапусціць. Яшчэ на працягу семестра вучэбна-выхаваўчая камісія факультэтаў сумесна з саветам выдатнікаў павінна выяўляць «патэнцыяльных» двоечнікаў, праводзіць работу з імі, арганізоўваць індывідуальную дапамогу. Павышэнне асабістай адказнасці кожнага выдатніка за паспяховасць таварыша—дзейсны шлях павышэння якасці ведаў студэнтаў.**

Вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі паказалі, што самая нізкая паспяховасць—на малодшых курсах. Таму вялікае месца ў рабоце савета выдатнікаў павінна займаць работа з І курсам. Ужо зараз на ўсіх факультэтах выдатнікі працуюць грамадскімі куратарамі і шэфамі першакурснікаў. Іх сіламі на ўсіх факультэтах быў арганізаван лекторый «Вучыся вучыцца». На лекцыях старшакурснікі дзеляцца са сваімі малодшымі таварышамі вопытам работы з вучэбнай і навуковай літаратурай, правіламі канспектавання, падрыхтоўкі да семінарскіх і практычных заняткаў, да сесіі, аказваюць канкрэтную дапамогу ў падрыхтоўцы да заняткаў. На хімфаку (адказная Л. Івашкевіч) за кожнай групай І курса замацаваны выдатнікі, якія праводзяць кансультацыі з адстаючымі. На ФПМ (адказны А. Тузікаў) устаноўлена шэфства груп ІІ курса над першакурснікамі. Цікавыя формы работы з І курсам на журфаку (адказная З. Русаковіч)—гэта анкеты, дыспуты, газеты, прысвечаныя першакурснікам, на філфаку (адказная Т. Пілецкая) была праведзена для студэнтаў першага курса прэс-канферэнцыя выдатнікаў ІІІ курса, на механіка-матэматычным выдатнікі-старшакурснікі рэгулярна выступаюць у газеце «Першакурснік», створан стэнд-інтэрв'ю з выдатнікамі. На фізфаку, геафаку, хімфаку, гістфаку, філфаку, радыёфізічным факультэце, ФПМ таксама ўдзяляюць увагу распаўсюджанню вопыту выдатнікаў з дапамогай сродкаў галоснасці.

**Выдатнікі універсітэта аказваюць пасільную дапамогу ў рабоце грамадскіх падрыхтоўчых курсаў (ГПК), дзе яны чытаюць лекцыі па розных прадметах.**

**Такім чынам у І семестры гэтага навучальнага года цікава і па-новаму пабудаваў сваю работу савет выдатнікаў універсітэта. Галоўная мэта нашай работы—дабіцца таго, каб кожны студэнт-выдатнік меў канкрэтнае заданне, усе сілы і энергію аддаваў вырашэнню нашай агульнай задачы ў ВНУ—падрыхтоўцы высокакваліфікаваных і грамадска актыўных спецыялістаў.**

**А. ПРАСВІРНІНА,**
**старшыня савета выдатнікаў БДУ.**



**Усё большае распаўсюджанне ва універсітэце набываюць тэхнічныя сродкі навучання. На здымку: у класе эксперыментальна-вылічальнай навучальнай сістэмы.** Фота **В. Драчова.**

Сацыялістычнае спаборніцтва

## Трывалыя сувязі

**Даўнія і трывалыя сувязі наладжаны паміж двума універсітэтамі: Белдзяржуніверсітэтам імя У. І. Леніна і Вільнюскім дзяржуніверсітэтам імя В. Капсукаса. Абмен вучонымі для чытання лекцый, сумесная навуковая работа, правядзенне навуковых канферэнцый, стварэнне аб'яднаных СБА, спартыўныя мерапрыемствы — вось такія формы супрацоўніцтва.**

**Добрай традыцыяй становіцца сацыялістычнае спаборніцтва, паміж дзвюма ВНУ. Вынікі сацспаборніцтва 1977 года работнікаў БДУ і ВДУ сведчаць аб выкананні і значным перавыкананні сацабавязацельстваў, якія былі ўзяты ў адказ на рашэнні XXV з'езда КПСС, пастанову ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб разгортванні Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае і якаснае выкананне народнагаспадарчага плана на 1977 год.**

**Перад вышэйшымі навучальнымі ўстановамі стаяць адказныя задачы па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, паскарэнню развіцця навукі і ўкаранення яе дасягненняў у вытворчасць, выхаванню высокакваліфікаваных кадраў — будаўнікоў камуністычнага грамадства.**

**Нядаўна БДУ з мэтай падпісання дагавору аб сацспаборніцтве на 1978 год і прыняцця сацабавязацельстваў наведалі прадстаўнікі Вільнюскага універсітэта. Новы дагавор — гэта адказ работнікаў БДУ і ВДУ на Пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне і перавыкананне плана 1978 года і ўзмацненні барацьбы за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы». Ён з'яўляецца адной з найбольш дзейсных форм мабілізацыі намаганняў калектываў дзвюх ВНУ краіны па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі, выкананню ўказанняў XXV з'езда КПСС па рашэнню галоўнай задачы, якая стаіць перад вышэйшай школай.**

**С. ІВАНОВА.**

## У ГАСЦЯХ У ГУРТКОЎЦАЎ

Гэтымі днямі на чарговым пасяджэнні студэнцкага навукова-даследчага гуртка па сучаснай беларускай мове, якім кіруе кандыдат філалагічных навук дацэнт Я. М. Камароўскі, выступіў вядомы беларускі мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага П. У. Сцяцко. Ён — аўтар рэгіянальных слоўнікаў заходніх раёнаў БССР, цікавых і каштоўных манаграфій «Народная лексіка і словаўтварэнне», «Беларускае народнае словаўтварэнне», вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў «Беларуская мова» (у сааўтарстве з М. Ц. Кавалёвай), «Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы» (у сааўтарстве з М. С. Яўневічам), шматлікіх артыкулаў па актуальных праблемах беларускага мовазнаўства.

У папулярнай, даходлівай форме даследчык расказаў аб важнейшых напрамках навукова-даследчай работы калектываў беларускіх вучоных Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР, філалагічных факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна, Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і іншых навуковых аб'яднанняў рэспублікі.

«Новая Канстытуцыя СССР, — падкрэсліў вучоны, — стварае неабмежаваныя магчымасці для далейшага росквіту ўсіх моў народаў вялікага Савецкага Саюза, для тэарэтычных даследаванняў агульных заканамернасцей развіцця моў у эпоху развітога сацыялістычнага грамадства». Даследчык спыніўся на важнейшых дасягненнях беларускай лінгвістыкі за 60 год Савецкай улады ў Беларусі і перспектыўных планах навукова-даследчай дзейнасці беларускіх філолагаў, вызначыў найбольш актуальныя праблемы і напрамкі, над якімі працуюць сёння беларускія лінгвісты.

Выступленне П. У. Сцяцко выклікала жывую зацікаўленасць у членаў нашага гуртка. Кожны з нас пранікся ўсведамленнем важнасці вывучэння ўзятых намі канкрэтных лінгвістычных тэм.

У заключэнне П. У. Сцяцко пажадаў нам выдатных поспехаў у навукова-даследчай працы, плённых вынікаў у правядзенні алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», у рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых прац.

**У. ЯНУКОВІЧ,**
**студэнт V курса філфака.**

# ХТО ПАЕДЗЕ ЗА МЯЖУ

Паміж БССР і краінамі сацыялістычнай садружнасці існуе традыцыя абмену студэнтамі па лініі азнаямленча - вытворчай практыкі. Гэтаму пытанню была прысвечана нарада ў Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

На нарадзе выступіў начальнік аддзела замежных сувязей міністэрства І. Прымачук. Ён падвёў вынікі абмену студэнцкімі групамі ў мінулым годзе. І. Прымачук падкрэсліў, што такі абмен Белдзяржуніверсітэтам у 1977 годзе праводзіўся на даволі высокім узроўні. Практыка студэнтаў была насычанай і эфектыўнай.

Сёлета наша рэспубліка накіроўвае за мяжу 41 групу студэнтаў. У БДУ будзе сфарміравана 11 груп. 4 з іх будуць накіраваны ў Іенскі універсітэт (ГДР). У саставе гэтых груп паедуць фізікі, матэматыкі, гісторыкі і філолагі. 3 групы, сфарміраваныя са студэнтаў мехмата, геафака, факультэта радыёфізікі і электронікі, пройдуць практыку ў Сафійскім універсітэце (НРБ). 2 групы філолагаў накіроўваюцца адпаведна ў Ягелонскі (ПНР) і Люблянскі (СФРЮ) універсітэты.

Зараз вядзецца падбор студэнтаў-кандыдатаў для праходжання практыкі ў сацыялістычных краінах. Гэта павінны быць лепшыя студэнты універсітэта, дастойныя прадстаўляць сваю навучальную установу за мяжой.

**В. ТАБУЛІН.**



Генадзь Бялькевіч, інжынер лабараторыі тэлебачання факультэта журналістыкі, аказвае вялікую дапамогу студэнтам у вывучэнні радыётэлевізійнай апаратуры. Працуе ён на кафедры РТ ужо шосты год, завочна вучыцца на журфаку.

Фота М. Федарэнкі.

# Камсамольская дапамога

Камітэт камсамола фізічнага факультэта БДУ шэфствуе над алімпійскім аб'ектам — рэканструкцыяй стадыёна «Дынама» ў Мінску. Работа ідзе пад лозунгам «Алімпійскім будоўлям — камсамольскі клопат і ўвагу». Цяпер тут працуе СБА імя Каралёва. Камісар атрада — І. Ларыёнаў. Рабяты выконваюць работу так званага «нулявога цыкла» — рыхтуюць месца для будпляцоўкі. Працуюць заўзята, з агеньчыкам.

— У атрадзе ёсць рабяты, якія ўжо працавалі на будаўніцтве у час трэцяга працоўнага семестра, — гаворыць камісар. Наш майстар У. Іванюковіч у мінулым годзе ездзіў у Карэлію на будаўніцтва горнаўзбагачальнага камбіната. В. Дземідовіч — камандзір атрада, таксама не навічок у будатрадзе. Я ў мінулым годзе працаваў на будаўніцтве ў горадзе Клецку. Мы як можам, дапамагаем нашаму маладому папаўненню.

Наш атрад займае другое месца па выніках падрыхтоўчага перыяду. Але мы прыкладзём усе намаганні, каб дабіцца найвышэйшых вынікаў.

**У. ДЗЬЯКАЎ,**
студэнт журфака.



На здымку: студэнты фізфака ў час работы на стадыёне «Дынама».

Фота аўтара.

## Да XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване

# Песню дружбы запявае моладзь

Актыўны ўдзел моладзі ў сусветным рэвалюцыйным працэсе — адна з характэрных рыс сучаснасці.

У міжнародны камуністычны рух уносіць вялікі ўклад моладзь Савецкага Саюза. Сёння Ленінскі камсамол супрацоўнічае і падтрымлівае сувязі з 1350 міжнароднымі, рэгіянальнымі і нацыянальнымі саюзамі і аб'яднаннямі моладзі ў 130 краінах свету.

Усё большую ролю ў мабілізацыі дэмакратычнай моладзі на барацьбу за мір, міжнароднае супрацоўніцтва, свабоду і незалежнасць народаў адыгрываюць сусветныя фестывалі моладзі і студэнтаў. З кожным Фестывалем расце іх папулярнасць.

Правядзенне маладзёжных форумаў прадастаўляе шырокім слаям працоўнай моладзі і студэнтам выдатную магчымасць для дыскусій, для дасягнення ўзаемаразумення паміж рознымі атрадамі дэмакратычнага маладзёжнага руху. Сусветныя фестывалі садзейнічаюць разгортванню барацьбы моладзі супраць імперыялізму, за мір, разрадку міжнароднай напружанасці, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс, прыцягваюць да антыімперыялістычнай барацьбы прадстаўнікоў розных саюзаў моладзі — працоўных, сялян, інтэлігенцыі, студэнтаў і навучэнцаў.

Палітычная накіраванасць садзейнічае абуджэнню інтарэсу значных груп моладзі да палітыкі, садзейнічае росту самасвядомасці моладзі. На працягу 30 год сусветныя фестывалі дакладна адлюстроўваюць расстаноўку палітычных сіл у міжнародным маладзёжным руху.

У лістападзе 1945 года ў Лондане на Сусветнай канферэнцыі прадстаўнікоў моладзі пяці кантынентаў была створана Сусветная федэрацыя дэмакратычнай моладзі (СФДМ). Ад імя 40 мільёнаў юнакоў і дзяўчат розных нацыянальнасцей, прадстаўнікоў больш 200 маладзёжных арганізацый, было заяўлена аб імкненні «змагацца за адзінства моладзі ва ўсім свеце, за адзінства моладзі ўсіх рас, усіх колераў скуры, усіх нацыянальнасцей і ўсіх вераванняў... змагацца за знішчэнне астаткаў фашызму на ўсёй зямлі... за глыбокую, шчырую дружбу народаў, за справядлівы і трывалы мір, ліквідаванне галечы і беспрацоўя».

На Лонданскай канферэнцыі было вырашана правесці летам 1947 года ў Празе Сусветны Фестываль моладзі і студэнтаў.

17.000 юнакоў і дзяўчат, якія прадстаўлялі 71 краіну, з'ехаліся ў сталіцу Чэхаславакіі. Фестываль праходзіў пад дэвізам «Моладзь, яднайся ў барацьбе за трывалы і доўгі мір!» На фестывалі ў Празе ўпершыню прагучала песня савецкага кампазітара Анатоля Новікава на словы паэта Льва Ашаніна «Гімн дэмакратычнай моладзі».

Летам 1949 года ў Будапешце праходзіў II Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Ворагі міру і дэмакратыі прыклалі немалыя намаганні, каб перашкодзіць правядзенню II Сусветнага фестывалю. З-за рэпрэсій і праследаванняў многія прадстаўнікі моладзі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі не змаглі прыехаць на Будапешцкі фестываль. Але на ім сабраліся 20.000 маладых людзей з 82 краін. Дэлегаты фестывалю пакляліся абараняць мір, весці барацьбу за нацыянальную незалежнасць, за правы моладзі і шчасце народаў.

**А. ДАНЕКІН,**
**загадчык інтэраддзела камітэта камсамола БДУ.**

**(Працяг будзе).**

## Група «Доўг» працягвае пошук

# З МАРАЙ ПРА НЕБА

Абрам Міхайлавіч Глезер прыйшоў у журналістыку 45 год назад. Амаль паўвека работы ў друку — гэтым можа ганарыцца не кожны.

У 1936 годзе Абрам Міхайлавіч заканчвае КІЖ і па камсамольскай пуцёўцы едзе рэдагаваць адну з газет на ваеннай будоўлі. Хутка А. М. Глезера накіроўваюць загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі ў лепельскую акруговую газету «Калгасная праўда», крыху пазней ён становіцца карэспандэнтам газеты «Піянер Беларусі».

Усю Вялікую Айчынную вайну прайшоў А. М. Глезер з вінтоўкай і пяром. Ён рэдагаваў ваенныя газеты: дывізійную авіяцыйную, затым карпусную артылерыйскую. Ці патрэбна гаварыць аб цяжкасцях журналісцкай працы, якая яшчэ дапаўняецца цяжкасцямі вайны!

Зараз вось ужо 19 год Абрам Міхайлавіч працуе ў аддзеле прапаганды «Сельской газеты». Аб часе вучобы ў КІЖы ў яго засталіся самыя светлыя ўспаміны. З асаблівай цеплынёй успамінае Абрам Міхайлавіч аб студэнтах сваёй групы: «Гэта былі цудоўныя хлопцы і дзяўчаты, вясёлыя, дружныя, згуртаваныя. Можа таму і зараз мы «не згубіліся», а перапісваемся адзін з адным, сустракаемся. Наша жыццё ў КІЖы было вельмі насычаным цікавымі справамі. Мы марылі аб ударных камсамольскіх будоўлях, нашы сэрцы былі там. Прагна сустракалі мы кожную новую звестку аб жыцці краіны. У 1935 г. у «Правде» ў сувязі з выхадам у свет кнігі М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» паявіўся нарыс М. Кальцова «Мужнасць». Наша група адразу ж адгукнулася на яго. Мы напісалі Астроўскаму ў Сочы гарачае пасланне, а праз тыдзень к вялікай нашай радасці атрымалі дарагую ўсім тэлеграму: «Усхваляван вашым цудоўным пісьмом. Маё бальшавіцкае прывітанне — Мікалай Астроўскі».

Абрам Міхайлавіч ганарыцца тым, што носіць імя кіжаўца. Ён лічыць КІЖ школай не толькі журналісцкага майстэрства, але і грамадзянскай сталасці. Пачуццё партыйнасці, высокай ідэйнасці — адметная рыса кіжаўцаў.

У КІЖы А. Глезер быў бязменным старастай планернага гуртка. Яго расказ аб сваіх сябрах-гуртко́ўцах мы прапануем сёння чытачам.

# МОЛАДЗЬ— НА ПЛАНЕР!

Мы былі дзецьмі свайго часу, бурлівага, гарачага, і імкнуліся ісці ў нагу з ім. Гэта быў час чалюскінцаў, першых прабегаў савецкіх аўтамашын па пустынях, штурмаў стратасферы; час хуткага росквіту парашутнага спорту і планерызму. «Усё вышэй і вышэй», — рвалі мы горла, сабраўшыся дружнай кампаніяй ці на вечарах, ці цвёрда чаканячы крок у студэнцкай калоне. Гэту песню спявалі ўсе — і хто марыў аб небе, і хто не думаў аб ім. Так, мы былі дзецьмі свайго часу, і таму не дзіўна, што ў нашым КІЖы разам з іншымі студэнцкімі гурткамі паявіўся гурток планерыстаў. Гэта быў наш водгук на лозунг «Моладзь — на планер!»

Успамінаю першы выезд на лётнае поле. Усе сабраліся вакол вучэбнага планера, і наш кіраўнік Дзеравянка (імя яго ўжо не памятаю) растлумачыў нам канструкцыю апарата, прызначэнне яго частак. Мы вучыліся кіраваць планерам, узлятаць, паварочвацца, прызямляцца. Колькі год прайшло, а не забыць першых палётаў! Адзін з нас садзіўся ў планер, астатнія бралі ў рукі канцы амартызатара (доўгія гумавыя канаты) і, разбегшыся, нацягвалі іх да адказу. Потым ішла каманда: «Старт». Пілот, націскаючы на педалі, адчапляў амартызатар, і планер, падскокваючы па зямлі, узлятаў у паветра. Ні з чым не параўнальнае пачуццё палёту! Спачатку лёталі па прамой, а калі асвоіліся, сталі ўзлятаць з узвышанасцей. Патокі паветра падхоплівалі планер, і мы падымаліся высока над палямі, рабілі віражы, павароты, а ўнізе, задраўшы галовы, стаялі сябры.

Заканчэнне вучобы ў гуртку адзначаў увесь інстытут. Адбыўся спецыяльны ўрачысты вечар. Нас цёпла віталі, уручылі пасведчанні, што з гэтай пары мы не хто-небудзь, а пілоты - планерысты класа «А». Мы хадзілі ганарыстыя і шчаслівыя. Праўда, лётчыкам ніхто з нас не стаў, лёс гуртко́ўцаў склаўся па-рознаму. Вера Канцэвіч усе 40 год працуе ў аддзеле пісьмаў «Комсомольской правды». Да апошніх год працавала ў выдавецтве «Беларусь» Тоня Фёдарава. Усю вайну і пасля яе працаваў у цэнтральнай авіяцыйнай газеце Ваня Бердніковіч.

Што ж, лётчыкамі мы не сталі, але асалоду лунання ў паветры адчулі. І гэта адно з яркіх успамінаў далёкага юнацтва, непарыўна звязанага з родным КІЖам.

**А. ГЛЕЗЕР,**
**стараста планернага гуртка.**

**Матэрыялы падрыхтавала член групы «Доўг», студэнтка II курса журфака А. Цярэнцьева.**

У. БЕЛЬСКІ

# ГЕАГРАФЫ

НАРЫС

(Працяг. Пачатак у № 9).

## ХТО ТЫ, КУРАТАР?

ПЕРШАЯ сесія прымусіла многіх задумацца. Толькі некалькі чалавек здалі яе на 4 і 5. Наогул групу можна было лічыць групай троечнікаў. Струк, стараста, падлічыў сярэдні бал. Вынік насуцяшальны.

Не радавала гэта і куратара. Не радавала — не тое слова. Хвалявала, і па-сур'ёзнаму. Часам з-за нейкай маленькай дэталі не хоча працаваць складаная машына. Там прасцей, бо існуюць правілы праверкі. А тут? Вось ён — складаны механізм, які пачаў псавацца. Не працуе тая маленькая дэталь, а яна не можа прыкмеціць. Зусім маленькую дэталь, простую і ў той жа час самую важную.

Людміла Андрэеўна бачыла адносіны студэнтаў у групе, але не ўмешвалася ў іх. І лічыла гэта правільным. Не абмяркоўвалі становішча і на сходах. Размовы б не атрымалася. Не ўсё бывае магчыма, нават пры агульнай шчырасці, і не ўсе дзверы пры дапамозе гэтага можна адкрыць.

Група была нейкая разнашэрсная. Але не магло быць групы, у якой інтарэсы ўсіх супадалі б. Не кожны мог вучыцца адразу толькі на выдатна, ён павінен быў перш за ўсё знайсці сябе. А гэта прыходзіць потым: знайсці сябе і на тым месцы застацца, раз і назаўсёды.

Кожны перш за ўсё павінен быць сапраўдным чалавекам. І куратар павінен выхоўваць не выдатніка, а Чалавека. Ці можна адной адзнакай усё вымераць? Калі ж гэта спрабуюць зрабіць, аказваецца, што немагчыма больш нічога сказаць аб чалавеку, акрамя таго, што ён выдатнік ці троечнік.

...Ёй падабаліся ўсе, асабліва спартсмены. Яна заўсёды з павагай адносілася да такіх людзей. Сама была спартсменкай. Спорт гартаваў і яднаў. Спорт не мог псаваць ні фізічна, ні маральна. Псавала слава, якая прыходзіла потым, за ступенямі п'едэстала. Гэта здарылася з Марчуком.

Цвёрда верыла ў Шкарупу і Недасеенку. Хлопцы былі на сваім месцы. У Недасеенкі не ўсё ладзілася дома, часта прапускаў заняткі, але стараўся не адставаць у вучобе. Шкарупу ведала яшчэ раней, да таго, як ён паступіў на геафак. Тут жа, на факультэце, вучыўся яго старэйшы брат Сяргей. На практыцы Сяргей прадставіў Сашу Людміле Андрэеўне, свайму куратару. «Я буду вучыцца ў вас і вашай групе, — сказаў Саша і дадаў: — Калі паступлю»... Гэта было даўно, Саша вучыўся ў сёмым класе. Яна паверыла і не памылілася: ён паступіў. Верыць яму і цяпер. Верыла і астатнім. Не давяраць людзям яна не мела права.

А група паверыла ёй! «Куратар» з агульнага слова стала больш асабовым. Яно ўжо не было такім незразумелым, як на першых парах.

Першакурснікі чакалі, калі Людміла Андрэеўна прыйдзе на куратарскую гадзіну. Звярталіся на калідоры, нават на вуліцы па розных пытаннях, студэнцкіх і асабістых. Яна радавалася гэтаму абуджэнню і ведала, што з кожным днём працаваць з моладдзю будзе ўсё цяжэй. На ўчынкі яе глядзелі па-рознаму, судзілі таксама па-рознаму. Напрыклад, тое, што яна выступала разам са сваёй групай у спаборніцтвах па валейболу, баскетболу, адны расцэньвалі як спробу набыць аўтарытэт сярод студэнтаў, другія гаварылі пра гэта як пра дзяцінства, несур'ёзнасць. Гаварылі, а самі сумняваліся ў сказаным. Дабіцца аўтарытэту толькі адной формай адносін нельга, павінен быць яшчэ і змест, бо аўтарытэт не бывае аднабокім. А змест тут быў, гэта ведалі ўсе, гэтага не адняць.

Набліжалася спецыялізацыя. На эканамічную геаграфію студэнты «ішлі» неахвотна. Тым, хто ішоў сюды, прыходзілася вельмі шмат працаваць. Некаторыя не вытрымлівалі, пераходзілі на завочны факультэт. Людміла Андрэеўна сказала ўсё, як яно было, ёсць, як будзе. Сказала, каб падумалі, перш чым даваць згоду ісці на «эканоміку». Яна не агітавала. Лічыла гэта нізкім у адносінах да прадмета, які паважала і любіла. Не хацела, каб на «эканоміцы» былі выпадковыя людзі. Няхай узважаць свае сілы, усе «за» і «супраць». Час яшчэ быў. Камплектацыю груп па спецыяльнасцях пачыналі толькі на другім курсе. Адказаў не патрабавала. Адказам на ўсе пытанні будзе яе новая група на другім курсе. Ёй не хацелася развітвацца ні з кім, да ўсіх прывыкла, з усімі пасябравала.

У душы жадала: а можа... Але жадання мала. Вельмі мала для таго, каб нешта збылося.

## У ПОШУКАХ СЯБЕ...

ЭКАНОМГЕОГРАФАМІ вырашылі стаць 11 чалавек. Патрэбны былі 21. Астатнія 10 чалавек прыйшлі з суседніх груп. (Потым з гэтых дзесяці застанецца толькі сем). Ядро групы склалі тыя, хто быў у ёй раней.

Другі курс — зноў амаль другая група. Праблема засталася той жа самай. Праблема, якая вось-вось здавалася вырашанай. Яе агаліла і абвастрыла «эліта» Тані Казаковай, Тані Раманюк, Іры Бачылы, Олі Валодзькінай, Лены Гусевай. Іх аўтарытэт на занятках асабліва ўзрастаў, калі яны прыходзілі ў джынсах або пашытых па апошняй модзе суконках. Гусева бачыла ў гэтым нейкую перавагу над астатнімі.

Аднойчы... Гэтае «аднойчы» надоўга застанецца ў памяці ўсіх. Яны памятаюць гэты дзень, які і з'явіўся пераломным у іх жыцці, жыцці групы. Усе прадсталі перад групай такімі, якімі былі на самай справе. Можа і не поўнасцю, але ў перавазе. Для гэтага патрэбна было так мала. Зусім маленькая дэталь, якую шукала Людміла Андрэеўна, самае простае, пра што гаварылі Шкарупа і Недасеенка, — паглядзець на сябе з боку. Паглядзець і ацаніць свае паводзіны, свой характар вачыма іншых. Вось і ўсё, што патрабавалася. Над гэтым Грышу Тыбербаю і старасце Мішу Струку давялося папрацаваць амаль цэлы месяц. Цэлы месяц яны збіралі па крупінцы матэрыялы для характарыстык. Зыходзілі з усіх пазіцый: паводзін, вучобы... Усяго каля дзесяці пунктаў. І вось аднойчы (няхай гэты дзень для нас застанецца як «аднойчы») Грыша зачытаў свой «трактат». Ніхто не пакрыўдзіўся.

Вось і ўсё. Толькі пасля гэтага нешта хляснула, надламалася і рассыпалася. Але ўсе ўздыхнулі з палёгкай, як уздыхаюць тады, калі пазбаўляюцца балючага мазаля.

Неяк па-іншаму сталі звяртацца адзін да аднаго. Гэта заўважылі ўсе, але не прызнаваліся, саромеліся. Сарамлівасць... Першая прыкмета шчырасці, чысціні душы. А ці бывае душа ў групы? «Калі аналізаваць: ад прыватнага да агульнага, то выходзіць, што...». Але гэта сказаў бы Недасеенка, «філосаф», як пачалі яго зваць. А як бы сказалі вы?

... Яны часцей сталі сустракацца, праводзіць вечары адпачынку, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Валік меў на гэта свой пункт гледжання і, відаць, цаніў яго, нават ганарыўся ім. Ну чаго збірацца, чытаць вершы, хадзіць разам у кіно, рабіць вечары адпачынку, каб танцаваць, калі гэта можна зрабіць паасобку! У сваёй групе дзяўчыну нават знайсці цяжка па душы, колькі іх — раз, два і аблічыўся. Так думалі некаторыя ў групе, так думаў і Валік. Толькі ён усё-такі прыйшоў...

— Ну, чаго ты прыйшоў, мала дзяўчат на танцпляцоўках, дык ты да сваіх? Што ж з «дзецьмі» рабіць будзеш? — Людміла Андрэеўна застала яго знянацку. Вугалькі вачэй смяяліся, радаваліся і ў той жа момант кпілі. Валік нічога не адказаў, толькі вырашыў «адпомсціць». Не адзін, са Шкарупай. Тыдзень яны выношвалі план, а потым аб'явілі ўсёй групе аб рашэнні... правесці «агеньчык». Усю падрыхтоўку бралі на сябе. «Агеньчык» прапанавалі зрабіць у лесе, у доміку паляўнічага.

Гэты «агеньчык» памятаюць цяпер як адзін з лепшых. Памятаюць, як чысцілі капусту на салат, як доўга чакалі Людмілу Андрэеўну. Яна пераблытала аўтобус і заехала не туды. Потым ішла па лесе больш дзесяці кіламетраў. Яе чакалі, пасля выставілі пікеты і дзяжурылі пяць гадзін. У адзінаццаць вечара сустрэлі...

Потым многа было сустрэч, «агеньчыкаў», паездак. Сустрэчы з Іванам Навуменкам, Нілам Гілевічам, Аляксандрам Мядзведзем. На другім курсе паехалі ў Львоў, потым у Талін. Сувязі, якія завязаліся тады з інстытутам народнай гаспадаркі, існуюць і па сённяшні дзень.

(Працяг у наступным нумары).

# На кафедрах і ў лабараторыях





Старанна авалодваюць ведамі і практычнымі навыкамі студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі нашага універсітэта.

На здымках: студэнты IV курса Т. Буракова і А. Бараховскі ў лабараторыі паўправаднікоў; малады спецыяліст Л. Гагустовіч толькі ў мінулым годзе закончыў радыёфізічны факультэт. Зараз працуе ў факультэцкай лабараторыі; студэнт III курса А. Абрамовіч на практычных занятках.

Фота **М. Дубовіка.**



# Дзелавая размова

Зімовая сесія ззаду. Студэнты падводзяць яе вынікі, намячаюць планы на будучае.

Члены камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта таксама сабраліся на чарговае пасяджэнне, якое праводзілася разам з дэканатам. Пачуць аб справах камсамольцаў, дапамагчы Ім добрай парадай прыйшлі дэкан факультэта А. С. Фядэнка, намеснік дэкана А. А. Бурдун, член партбюро А. В. Яраксін.

На парадку дня — вынікі зімовай сесіі і грамадска-палітычная атэстацыя.

Аб тым, як мехматаўцы закончылі першы семестр, расказала намеснік сакратара камітэта камсамола па акадэмічнай рабоце Тамара Падабед. Яна адзначыла, што паспяховасць студэнтаў склала 94,1 працэнта. Знізілася колькасць непаспяваючых.

У спаборніцтве на лепшую паспяховасць факультэт упершыню заняў пятае месца. Гэтаму садзейнічала стварэнне вучэбна-выхаваўчай камісіі. Рэйдавая брыгада камісіі чатыры разы ў месяц правярала наведванне студэнтамі заняткаў; вынікі праверак шырока асвятляліся ў друку.

Значная работа была праведзена са студэнтамі I курса. Прайшлі азнаямленчыя сходы з удзелам выдатнікаў мехмата,. якія расказалі першакурснікам, як трэба планаваць свой працоўны дзень, рыхтавацца да заняткаў.

Рэгулярна працавалі лекторый «Вучыся вучыцца» і кансультацыйныя пункты.

Тамара адзначыла не толькі станоўчае, але і адмоўнае. Напрыклад, вучэбна-выхаваўчая камісія не змагла павесці барацьбу са шпаргалкай, не на ўсіх патоках арганізавана прайшлі сходы па падрыхтоўцы да сесіі.

Намеснік дэкана А. А. Бурдун напомніў студэнтам словы Пятра Міронавіча Машэрава аб тым, што камсамольскія арганізацыі паступалі б правільна, калі б з такой ініцыятывай і энтузіязмам ставіліся да рашэння пытанняў вучэбнага працэсу, як і да арганізацыі культурна-масавай работы. А. А. Бурдун адзначыў, што перад сесіяй актыўнасць камітэта камсамола павысілася. А вось у час экзаменаў камітэт бяздзейнічаў. Некаторым членам камітэта можна было б дазволіць здаць экзамены датэрмінова, і ў іх вызваліўся б час для грамадскай работы.

— Неабходна ў сціслы тэрмін прадумаць сістэму работы з чацвёртым і пятым курсамі, дзе назіраецца дрэннае наведванне, — адзначыў Аляксей Аляксандравіч. — Трэба своечасова аформіць наглядную агітацыю і правесці на высокім узроўні алімпіяду «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», прысвечаную 60-годдзю Ленінскага камсамола.

Твары рабят сур'ёзныя. Ёсць над чым падумаць. Многа зроблена, многа належыць здзейсніць. А. С. Фядэнка падкрэсліў, што з боку выкладчыкаў праводзіцца пэўная работа па паляпшэнню вучэбнага працэсу. Працуе навукова-метадычны семінар, на якім абмяркоўваюцца вучэбныя праграмы, уносяцца ў іх мэтазгодныя змены.

Прысутныя абмеркавалі таксама пытанні грамадска-палітычнай атэстацыі, якая прайшла на мехмаце з 18 па 28 лютага.

**Л. ЯЦЭВІЧ.**

**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

### Да міжнароднага дня тэатра

# Студэнцкі народны

**Студэнцкаму тэатру БДУ ў кастрычніку мінулага года споўнілася 50 гадоў. Яму 50, а ён малады і застаецца такім заўсёды. Як мы паведамлялі, нядаўна тэатр пачаў насіць ганаровае званне «народны». Сёння мы змяшчаем інтэрв'ю нашага няштатнага карэспандэнта Н. Попель (прэс-цэнтр прафкома) з рэжысёрам тэатра А. М. ОЗЕРАВЫМ.**

**— Аляксандр Міхайлавіч, пракаменціруйце, калі ласка, рэпертуар тэатра. Як прымаюцца спектаклі гледачамі!**

— Пастаноўка на студэнцкай сцэне такіх п'ес, як «Маладая гвардыя» А. Фадзеева, «Казка аб праўдзе» М. Алігер, «Заканыя» Т. Ян, «Маці» К. Чапека, вызначыла асноўную накіраванасць тэатра як героіка-патрыятычную. Пазней рэпертуар расшырыўся, мы ўвялі ў яго і камедыю, і сучасную драму. Студэнты з цікавасцю глядзелі пастаноўку п'ес сучасных драматургаў М. Рошчына («Валянцін і Валянціна»), Л. Жухавіцкага («Адны без анёлаў»), А. Арбузава («Далёкая дарога»), І. Альшанскага («Восьмы колер вясёлкі»).

Канешне, адны пастаноўкі мелі больш поспех, другія — меншы. Але галоўнае, сцэна не пакідала ў зале абыякавых. Для нас, стваральнікаў спектакля, вельмі важна ведаць думкі гледачоў. Калі мы паказвалі трагедыю Шэкспіра «Рамэо і Джульета», адчулі, як блізка ўспрынялі студэнты падзеі, што адбываюцца на сцэне. Пасля спектакля многія з іх засталіся ў зале. Хто выказваў словы ўдзячнасці, хто— крытычныя заўвагі. Хачу адзначыць, што спектакль «Рамэо і Джульета» ўспамінаюць даволі часта. Успамінаюць і гледачы, і артысты. Дарэчы, кожная рэпетыцыя тады праходзіла так, быццам мы рыхтаваліся паказаць свой спектакль самому Шэкспіру. Увогуле ўсе члены тэатра — і выканаўцы ролей, і «масоўка» — людзі, вельмі захопленыя сцэнай.

**— Раскажыце аб іх больш падрабязна.**

— Наш тэатр спецыфічны. Гэта звязана з пяцігадовым цыклам навучання студэнтаў. 5 год — і мы расстаёмся з акцёрамі, гледачамі. «Цякучасць кадраў» адбываецца не па нашай волі. Месцы тых, хто ўжо атрымаў дыплом, займаюць члены тэатральнай студыі. Студыя — гэта наша база. Нехта прыходзіць сюды зусім «зялёным», у некага за плячыма ёсць вопыт школьных спектакляў. У студыі студэнты засвойваюць азы тэатральнага майстэрства, далучаюцца да цудоўнай і вельмі цяжкай працы артыста. Потым — сцэна.

Зараз касцяк трупы тэатра складаюць студэнты журфака, філфака, ФПМ, гістфака. Гэта вялікія энтузіясты сцэны. Уявіце сабе — трэба паўдня слухаць лекцыі, а затым да паўночы рэпеціраваць.

Часта ўспамінаю сваіх выхаванцаў, рабят, якія скончылі БДУ і ўжо працуюць. Гэта А. Пятроў, Ю. Шакло, А. Зартайскі, М. Крывашэева, Т. Скудная, В. Січэйка, Т. Касцецкі, А. Цыгулёў і іншыя. Т. Касцецкі працуе зараз у тэатры музкамедыі БССР, а Т. Скудная — артыстка Віцебскага абласнога тэатра. Наш тэатр аказаўся для многіх адпраўным пунктам на вялікую сцэну. Многія закончылі потым студыю акцёрскага майстэрства пры тэатры імя Янкі Купалы. А вось Анатоль Касцецкі спрабаваў свае сілы ў рэжысуры. Ён працаваў над спектаклем «Валянцін і Валянціна». Пастаноўка, на мой погляд, удалася.

**— Аляксандр Міхайлавіч, мы ведаем, зараз Вы працуеце над п'есамі «Шасцёра любімых» А. Арбузава і «Каханне, джаз і чорт» Ю. Грушаса. Аб чым будуць спектаклі!**

— Канешне, аб моладзі, аб іх імкненнях, марах, думках... На сцэне вы ўбачыце А. Марозава, Н. Хіневіч, Т. Каралюк, В. Каліноўскага і многіх іншых сваіх аднакурснікаў.

Прыходзьце на прэм'еру!



**Дзяжурны на геафаку.**

Фота **М. Ісачанкі.**

# ...І БЫЎ МЕДЫУМ

Мы правучыліся на факультэце два з паловай гады, адчулі сябе паўнапраўнымі членамі яго калектыву, і вось гэты калектыў разам з намі адзначае наш медыум.

«Медыум?» — перапытваюць многія, пачуўшы ад вас гэтае слова. Так, так, медыум: сярэдзіна, экватар, палова студэнцкага жыцця. Медыум — гэта тая, першая частка шляху. якая ўжо (на шчасце ці на жаль?) не будзе падобна на другую.

Медыум — вялікае свята для нас. Крыху сумнае, больш вясёлае, і калі ўлічыць, што на ім нам, трэцяму курсу, уручылі вымпел за перамогу ў факультэцкім сацыялістычным спаборніцтве, то і даволі ўрачыстае.

Да сустрэчы на медыуме мы падрыхтавалі цэлы атрад маладых, поўных сіл і запалу «байцоў»— А. Марозава, Л. Жогаль, С. Сасіма, Я. Чаплю, В. Аляшкевіча і многіх іншых. «Байцы» былі ўзброены ўсім запасам гумару, што знайшоўся на трэцім курсе.

Мы шчыра хацелі, каб на нашым свяце было весела ўсім, і таму вялі размову не толькі аб сабе, але і аб тых, з кім непасрэдна звязан амаль кожны дзень студэнта — аб выкладчыках. Мы «ударыліся» ва ўспаміны, але гледачы прабачылі нам гэта. Яны з захапленнем прынялі «маленькія карцінкі» з жыцця ваеннай кафедры. Крыху напружыўшыся, мы уявілі сцэны з нашай будучыні: кім мы станем, ну, хаця б праз дзесяць год?

Ах, медыум, медыум! Ты прымусіў нас падлічыць, колькі братоў-студэнтаў мы згубілі ў баях за веды. Ты паказаў, колькі мы «паспелі паспець».

Нас вельмі кранула тое, што нашы малодшыя таварышы, студэнты другога курса, не пакінулі без увагі ўрачыстасць. Цікава было ўбачыць, якімі нас ўяўляюць сябры з іншых курсаў.

Нам сумна думаць аб тым, што ўжо палова вучобы ва універсітэце ззаду. Але, магчыма, другая палова будзе не горшай?

**Н. ФІЛОНЕНКА,**
студэнтка III курса
факультэта журналістыкі.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Творчая садружнасць БДУ і опернага тэатра налічвае некалькі гадоў. Студэнты і супрацоўнікі універсітэта ў мінулым годзе пазнаёміліся з балетам А. Пятрова «Стварэнне свету», операй Р. Вагнера «Лаэнгрын», балетам А. Адана «Жызэль», операй Г. Даніцэці «Дон Паскуале». У гэтым годзе ім прадстаіць паглядзець балет «Рамэо і Джульета» С. Пракоф'ева, «Камерную сюіту» Р. Шчадрына і іншыя творы.

Першым спектаклем гэтага сезона была опера А. Даргамыжскага «Русалка». Нядаўна студэнты сустрэліся з выканаўцамі галоўных ролей: заслужаным артыстам БССР Віктарам Гур'евым, лаўрэатам Ўсесаюзнага конкурсу Інэсай Адзінцовай, адказным за спектакль Маргарытай Елізар'евай і канцэртмайстрам тэатра Георгіем Карантам. Яны даведаліся аб тым, як здзяйснялася пастаноўка спектакля, з якімі цяжкасцямі сутыкнуліся артысты пры рабоце над ролямі. Сустрэча прайшла ў цёплай сяброўскай атмасферы. Хочацца выказаць упэўненасць, што такая форма супрацоўніцтва будзе мець месца і ў далейшым.

**В. ХЛЫНІНА,**
член савета клуба
аматараў тэатра.



**Нядаўна праходзілі спаборніцтвы лёгкаатлетаў ВНУ Беларусі. На гэтых спаборніцтвах добра выступілі спартсмены БДУ. На здымку: В. Ткач (№ 39), студэнт БДУ, які выйграў адзін з забегаў на 3000 м.**

Фота **А. Веруша.**

# НОВЫЯ КНІГІ

**У кабінет сацыяльна-эканамічных і гістарычных навук паступіла наступная літаратура:**

1. Экономика промышленности СССР. Под ред. Б. М. Левина. Учебник для вузов. М., «Высшая школа». 1977.

2. Ленинское учение об империализме и особенности современного этапа общего кризиса капитализма. Прага, «Мир и социализм», 1976.

3. **Исаев В. И.** Выравнивание и рациональное использование доходов колхозов. М., «Колос», 1977.

4. **Бузуев В. М.** Особенности социалистического соревнования в условиях научно-технической революции. М., «Экономика», 1977.

5. **Смирнов Б. В.** Функции управления социалистическим производством. М., «Экономика», 1977.

6. **Гилицкий Ф. И.** Социально - экономические проблемы трудовых ресурсов Белорусской ССР. Мн., «Наука и техника», 1977.

7. Социально - экономические проблемы труда: организация, планирование, управление. М., «Мысль», 1977.

8. Плановый баланс народного хозяйства. М., «Экономика», 1977.

9. Оплата труда при социализме: вопросы теории и практики. М., «Экономика», 1977.

10. Экономические проблемы развитого социалистического общества. Редколлегия: П. И. Багрий (отв. редактор) и др. Киев, «Навукова думка», 1977.

11. **Максимова М. М.** СССР и международное экономическое сотрудничество. М., «Мысль», 1977.

12. **Брагина Е. А.** Развивающиеся страны: государственная политика и промышленность. Отв. редактор Р. М. Аваков. М., «Мысль», 1977.

13. Экономическая интеграция и материально-техническая база стран СЭВ. Под редакцией И. П. Олейника и В. П. Сергеева. М., «Мысль», 1977.

14. Иностранный капитал и иностранное предпринимательство в странах Азии и Северной Африки. М., «Наука», 1977.

15. **Усоскин В. М.** Финансовая и денежно - кредитная система США. М., «Финансы». 1976.

16. Машинная обработка экономической информации в финансово-кредитной системе. Сборник задач. Учебное пособие для вузов. М., «Финансы», 1977.

17. Методика подготовки к семинарским занятиям по политической экономии. Под редакцией Ю. А. Комарницкого. Учебно - методическое пособие. М., «Высшая школа», 1977.

**Н. СЛАВИНСКАЯ,**
ответственная
за работу
кабинета.

Рэдактар **А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03137 Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Зак. 462.